# Ведамасці

Гарадская газета Гродна № 2 23 ліпеня 2007


**Шок!**

*Сакрэтныя дакументы, фота трупаў, урэшце, адрэзаныя чалавечыя пальцы – усё гэта пакінулі гарадзенскія міліцыянты ў былым будынку Кастрычніцкага РАУС.*

# Наслядзілі

**З будынку на Карбышава,15 Кастрычніцкі РАУС перасяліўся больш года таму. Але цяперашні стан унутраных памяшканняў стварае ўражанне быццам міліцыянты тэрмінова ўцякалі – столькі нечаканых рэчаў пакінулі яны пасля сябе.**

Увайсці проста – будынак не ахоўваецца, ён нават не зачынены. З боку вуліцы Сацыялістычнай праз высокую металічную браму можна трапіць ва ўнутраны двор былога спецпрыёмніка і пачаць экскурсію па былых міліцэйскіх кабінетах.

Менавіта такім шляхам увайшоў у РАУС маладафронтавец Яўген Скрабутан:



**"Стол замест абруса накрыты сённяшнім чырвона-зялёным сцягам. Гэта ў малым пакойчыку ў падвале. Відавочна , што тут было нешта кшталту лабараторыі: мікраскопы на стале, слоўнікі руска-беларускія, лямпы. Усё пакрытае пылам"**

**"Што ўразіла: горбы нататнікаў, дакументы па крымінальных справах, унутраная перапіска, загады – валяюцца раскіданыя па падлозе і сталах. А гэтыя пазыўныя спецсувязі – так і засталіся вісець на сцяне"**










**"У кабінеце з шыльдай "Начальник ОВД Бет Л.А." – стосы бюлетэня "Предприниматель" за 2005 год, які выпускаў былы палітвязень Валер Леванеўскі"**



**"Приказы по инвентаризации оружия" – там пазнака, што яны павінны захоўвацца напрацягу 5 гадоў. Дата закрыцця гэтага журнала – 2005 год. Значыць, ён павінен у іх захоўвацца да 2010 года"**



**"Гэта фотаздымкі людзей, якія займаліся кватэрнымі крадзяжамі. Старыя фота, там ёсць пазнакі: "забіты", "памёр", "павесіўся". Там жа я знайшоў і дзьве торбы фота з трупамі"**

**"Міліцыянты – звычайныя беларускія людзі: п'юць піва, гарэлку, на працы таксама..."**



**"Гэта ў падвале. Выпадкова навёў ліхтарык – а там шкляны слоік, а ў ім – вось... чалавечыя пальцы"**




## Ідэолагаў звальняюць?

**Чуткі**

**«Ведамасці» маюць інфармацыю, што пад пагрозай адстаўкі знаходзіцца галоўны ідэолаг Гарадзенскай вобласці, намесніца старшыні аблвыканкама Марыя Бірукова. Афіцыйнага пацверджання адстаўкі няма, але паводле некаторых звестак з панядзелку, нечакана для падначаленых, Марыя Міхайлаўна сышла ў адпачынак.**

А вось факт зняцця з пасады намесніка старшыні Гродзенскага гарвыканкама Валянцін Лявонаў - пацверджаны. Ад нядаўняга часу яго імя прыбрана са спісаў кіраўніцтва горада на афіцыйным сайце гарвыканкама, а сам Лявонаў прымервае цца да крэсла дырэктара адной з спецыялізаваных гродзенскіх школ.

Выклікае ўвагу тое, што гэтыя нечаканыя адстаўкі адбыліся пасля скандальнай гісторыі. У другой палове мая Гродна наведвалі чыноўнікі надзвычай высокага рангу з Мінску. Гродзенская вертыкаль, нібыта, распарадзілася сабраць з кожнай турыстычнай фірмы Гродна на годны прыём гасцей па 100 тысяч рублёў. Інфармацыя пра паборы, падхопленая незалежнымі журналістамі, патрапіла ў СМІ. І дайшла да мінскіх гасцей. Тыя ў сваю чаргу былі абураныя тым, што іх імёны ўзгадваюцца з падобным падыходам да гасціннасці. Гэта і стала прычынай скандала і разноса, які цяпер звязваюць з адстаўкамі гродзенскіх чыноўнікаў.

Рэдакцыя

# Бардзюраў не будзе

**Толькі шэсць унікальных бардзюраў 30-х гадоў з клеймамі “Magistrat Miasta Grodna” застануцца на Савецкай вуліцы ў Гродне. Чыноўнікі загадалі зняць гістарычны брук і з вуліцы Ажэшкі.**

Як паведаміў аўтар праекта “рэканструкцыі” Савецкай вуліцы, архітэктар інстытута “Гроднаграмадзянпраект” Аляксандр Захарчук, толькі шэсць бардзюраў з клеймамі “Magistrat Miasta Grodna” будаўнікі вернуць на месца. Па словах чыноўніка, іх выкладуць каля помніка Сакалоўскаму ў якасці экспаната для турыстаў, а далей павуліцы бардзюры і ходнікі зробяць з украінскага граніта.

Гэты “план шасці бардзюраў” відавочна ўзнік раптоўна. Адразу пасля пачатку рэканструкцыі і галоўны архітэктар горада Уладзімір Анісімаў і старшыня гарвыканкама Аляксандр Антоненка і прарабы з Савецкай заяўлялі, што ўсе бардзюры і ўвесь брук будзе вернуты на месца.




Фота: harodnia.com

Цяпер гэта «вторсырьё»

Аднак на сённяшні дзень будаўнічыя работы ля помніка Сакалоўскаму практычна скончаныя, але нават тыя шэсць абяцаных бардзюраў з клеймамі - там так і не з’явіліся.

Пасля таго як «Ведамасці»ў першым нумары ўзнялі тэму знікнення рарытэтаў, афіцыйная газета «Вечерний Гродно» са спасылкай на начальніка аддзела камунальнай гаспадаркі Ленанінскага раёна Аляксандра Архіпава паведаміла, што бардзюраў з клеймамі “Magistrat Miasta Grodna”на Савецкай больш не будзе.

Актывіст грамадзянскай кампаніі “Выратуем Гародню” Алесь Залеўскі называе гэтыя дзеянні ўладаў цынізмам: ***“Наша ўлада чарговы раз паказала, што яны да жыхароў ставяцца, як да быдла. Яны самі парушаюць свае ўласныя абяцанні, што ўсё будзе вернутае на месца. Мы атрымалі чарговае пацвярджанне, што з гэтымі людзьмі не можна весці ніякіх перамоваў!”***

Колькі дакладна было ўнікальных бардзюраў – лічбы чыноўнікаў ды грамадскіх актывістаў разыходзяцца. Па словах Захарчука ўсяго іх было толькі 12, прычым, сцвярджае чыноўнік, два раскалоліся, калі іх даставалі бульдозерам з Савецкай вуліцы. Краязнаўца Ян Лялевіч паведаміў “Ведамасцям”, што мінулым летам ён перапісаў і сфатаграфаваў усе бардзюры з клеймамі “Magistrat Miasta Grodna”, ад крамы “Евросеть” да гандлёвага дома “Нёман” - іх аказалася 44.

Як удалося высветліць актывістам гродзенскага Руху “За Свабоду”, цяпер гэтыя рарытэты пачатку XX стагодзя зваленыя на базе прадпрыемства “Рэмдарбуд” на вул. Дзяржынскага. Яны лічацца “беушным” матэрыялам і прызначаныя да паўторнага выкарыстання дзе-небудзь у дварах новых мікрараёнаў.

Аднак знікненнем гістарычных бардзюраў знішчэнне самых старых вуліц цэнтра горада не скончыцца. Амаль стагадовы брук будзе зняты з вуліцы Ажэшкі ў раёне галоўнага корпусу Універсітэта імя Я. Купалы і аблвыканкама. ***“Там жа немагчыма вуліцу пераходзіць!*** – тлумачыць Аляксандр Захарчук. – ***Трэба рабіць гранітныя пераходы. Гэта дапушчальна: метры 4 выкласці гранітам”***.

На самой справе брук будзе прыбірацца дзеля таго, каб выкласці ім разбураныя кавалкі ў іншых месцах. Таму будзе звужацца і брукаванка Савецкай вуліцы, да 8.15 м, а каля гандлёвага дома “Нёман” – нават да 6 м, ходнікі пашыраюць прыкладна на 40 см. Усё гэта Захарчук назваў “зварот матэрыяла”. Рабіць аналагічны брук сучасныя майстры не навучыліся. Цяпер трываюць эксперыменты ў гродзенскай фірме “Будоўля”, але пакуль няўдалыя.

***“Ён, гэты брук, 70 год добра праляжаў, але вось як памянялі барты, што яго трымалі – ён пачаў раскалвацца! Пакуль быў заціснуты – ляжаў нармальна, а цяпер – самі бачыце...”*** – сказаў Захарчук, чым прызнаў, што гарадзенская ўлада спачатку робіць, а пасля думае.

**Раман Суліма**

## Даведка

Бардзюры з клеймамі “Magistrat Miasta Grodna” ды брук былі выкладзеныя на цяперашніх вуліцах Савецкай ды Ажэшкі яшчэ ў 1936-1938 гадах. Каштоўнасць гэтых рарытэтаў відавочная: па-першае, на Беларусі больш нідзе не захавалася нічога падобнага; па-другое, бардзюры і брук – гэта сапраўдны тэхналагічны фенамен, іх якасць, эстэтычнасць і трываласць (у нязменным стане захоўваюцца 70 год) не могуць паўтарыць сучасныя вытворцы.

**www.harodnia.com**

*Прызначаны пад знос будынак па вул. Сацыялістычнай, 44, архітэктурны помнік 2-й катэгорыі гарвыканкам выставіў на аўкцыён.*

# На продаж

**Аўкцыён адбудзецца 13 жніўня. Гарвыканкам вызначыў для будынка па вул. Сацыялістычнай, 44, каштоўнага прыкладу беларускага мадэрну XIX стагоддзя, першапачатковы кошт у 801 мільён рублёў.**



Фота: «Наша Ніва»

Архітэктурны помнік 2-й катэгорыі - цяпер лот аўкцыёна

Гэтая сума - самая высокая на прададзеныя за апошнія гады будынкі ў гістарычным цэнтры Гродна. Для прыкладу, пачатковы кошт на большы па плошчы дом купца Мураўёва, што на Савецкай плошчы – быў 240 мільёнаў. А на палац рода Сегеняў у Красках (Ваўкавыскі р-н) - вялікі, добра захаваны палац з паркам - пачатковы кошт пастаўлены ў 450 мільёнаў рублёў.

Як патлумачыў кіраўнік камунальнага аддзела гарвыканкама Святаслаў Карпінскі, будынак па вул. Сацыялістычнай, 44 ацэнены па рынкавым кошце, а не па балансавым, як ацэньваліся аб’екты раней. Згодна прэзідэнцкаму Указу, які ўвайшоў у сілу 13 красавіка гэтага года, новы парадак ацэнкі гістарычных архітэктурных помнікаў павінна вызначыць Міністэрства культуры – аднак дагэтуль ніякага дакумента на гэты конт няма. ***“Таму мы на ўсяляк і выпадак выстаўляем максімальны кошт. А калі будынак не прадасца – тады ўжо можна знізіць,*** - тлумачыць Карпінскі. - ***Усё спадзяемся, што можа з’явяцца ў нас іншыя метады ацэнкі”.***

Пабудаваны ў канцы XIX стагоддзя двухпавярховік па вул Сацыялістычнай, 44 з’яўляецца архітэктурным помнікам 2-й катэгорыі. Па ацэнцы гісторыкаў гэта – адзін з найкаштоўнейшых прыкладаў беларускага мадэрна з рэдкім аздабленнем фасада.

Нягледзячы на гэта, у красавіку з падачы гродзенскага гарвыканкама навукова-метадычная Рада Міністэрства культуры зацвердзіла яго пад знос. Зямельная пляцоўка пад ім меркавалася для продажу па выразу галоўнага архітэктара Гродна Уладзімера Анісімава “расійскім і мінскім парням” пад навабуд. Будынак мог быць разбураны ўжо ў чэрвені, аднак у ліпені гарвыканкам выставіў яго на продаж.

Спецыяльныя ўмовы продажу будынка па вул. Сацыялістычнай,44: патэнцыйны інвестар павінен захаваць гістарычнае аблічча камяніцы і ўвесці яе ў эксплуатацыю за два гады. З гледзішча таго, што будынак унесены ў рэестр архітэктурных помнікаў - згодна рэжыму захавання, інвестар будзе абавязаны рэстаўраваць яго. Гэтая каштоўная і доўгая працэдура абыйдзецца інвестару не меней як у суму параўнальную з коштам продажу.

Па словах Карпінскага, цікаўнасць да будынка патэнцыйныя інвестары выказваюць, але пакуль заяўкі на яго ніхто не падаў. Спецыяліст не здзіўляецца гэтаму, вялікіх спадзяванняў на тое, што будынак будзе прададзены, у яго няма. ***“Калі пакупнікоў не знойдзецца – будзем зніжаць кошт”,*** - гаворыць Карпінскі.

**Віктар Куц**

# Косткі каля сінагогі

**Чалавечыя косткі і чарапы выкапалі будаўнікі падчас земляных працаў каля гродзенскай сінагогі.**

Каля гродзенскай сінагогі з боку Вялікай Траецкай вуліцы – катлаван даўжынёй каля 20 метраў ды глыбінёй з чалавечы рост. У панядзелак разам з грунтам экскаватар выкінуў на паверхню парэштці, як ацанілі гісторыкі, мінімум двух чалавек – чэрап, берцовыя косткі ды рэбры. Чалавечыя косткі валяліся навідавоку проста на купах грунту.



Фота: «Ведамасці»

Чалавечыя косткі ляжалі на паверхні два дні

Дакладны ўзрост выкапаных парэшткаў гродзенскія гісторыкі вызначаюць XIX альбо пачаткам XX стагоддзя. У адвалах таксама знайшлі кавалкі кафлі і керамікі больш ранняга перыяду.

Як паведаміў “Ведамасцям” адзін з гродзенскіх гісторыкаў, будаўнікі распачалі работы каля сінагогі без абавязковага нагляду археолагаў, і гэтым парушылі заканадаўства: ***“Гэта варварства. Сінагога знаходзіцца ў археалагічнай ахоўнай зоне, таму ўсе земляныя работы тут павінны весціся толькі пасля папярэдніх археалагічных даследванняў. А на гэтай тэрыторыі, дзе асабліва багаты культурны слой, археалагічныя раскопкі павінны ісці нават не адзін год”.***

З такой ацэнкай згодны і аўтар археалагічнай ахоўнай зоны гістарычнага цэнтра Гродна доктар гістарычных навук Алесь Краўцэвіч.

Падобная сітуацыя ўзнікла ў мінулую восень, калі будаўнікі раскапалі вялікія яміны каля пажарнай вежы. Тады на двухметровай глыбіні былі знойдзены шкілеты некалькіх чалавек – але толькі пасля ўмяшальніцтва пракуратуры працы былі спыненыя, а навукоўцы змаглі атрымаць адкрыты ліст на правядзенне аварыйных раскопкаў.

***«Аварыйныя раскопкі праводзяцца тады, калі культурны слой знаходзіцца на мяжы знішчэння і яго трэба тэрмінова ратаваць»***, - тлумачаць гродзенскія гісторыкі.

Па словах Алеся Краўцэвіча, гэтым разам будаўнікі, пабачыўшы выкапаныя косткі, адразу заключылі дамову з Гродзенскім Універсітэтам на правядзенне аварыйных даследванняў. Цяпер на месцы раскопу працуюць археолагі.

**Радыё Рацыя**

*Государство намерено забрать 51% бизнеса беспошлинной торговли. Пока с этим не согласятся фирмы Duty free, их магазины будут закрыты*

# Передел Duty free

**С 1 июля по периметру белорусской границы закрыты более 50 магазинов беспошлинной торговли. Уволены около 2 тысяч их работников. Дешевые импортный алкоголь и сигареты, основной товар магазинов беспошлинной торговли – пылятся на складах. Белорусы теперь покупают ту же продукцию в магазинах внутри страны по ценам в три-четыре раза большим.**

И такая ситуация продлится до той поры, пока фирмы-владельцы магазинов беспошлинной торговли не согласятся поделиться своим бизнесом с государством, а именно – не отдадут большую половину “пирога”.

Во всей Беларуси теперь работают только две торговые точки Duty free: в аэропорту «Минск-2» и магазин для обслуживания дипкорпуса, который принадлежат Управлению Делами президента (УДП).

На Гродненщине закрыты 14 магазинов Duty free (четыре точки на ж/д вокзале, по столько же – на ПТО «Брузги» и ПТО «Берестовица», две - на ПТО «Привалка»). Владельцы магазинов: ИП «Новые восточные инвестиции», СП «Бела Трэйдинг», СП «Хелен Валери» и СП «Селви» - частично уволили продавцов.

Закрытие магазинов Duty free ударило по нескольким группам постоянных покупателей Гродненщины. Во-первых, примерно полторы тысячи гродненцев промышляли вывозом в Польшу и Литву дешевых водки и сигарет.

«***Легально ввозить в Польшу можно только один литр водки и один блок сигарет. Конечно, сигарет я вывозила больше, потому что их можно припрятать. С закрытием Duty free мы вывозим дешевый российский табак, но его не очень хотят брать. Думаю, это моя последняя поездка. И я не представляю себе, где теперь найду работу*** », - рассказала нелегальная перевозчица спиртного и алкоголя Юлия.

Во-вторых, постоянными покупателями магазинов Duty free были любители качественного алкоголя ведущих мировых фирм: здесь его можно было приобрести по доступным ценам. С 1 июля гродненцы покупают его внутри страны намного дороже. Например 1 литр вермута “Martini” в магазинах Duty free ж/д вокзала стоил 6 евро, в “Батории” теперь его цена 37 тыс руб, текила “Sauza”, 1 литр, стоила 13 евро - “Батория” теперь предлагает 0,7 литра за 96 тыс руб.

Однако как сообщил торговый представитель по Гродненской области ООО “МидВест” Юрий Саросек, продажи дорогого алкоголя в магазинах Гродно увеличились в несколько раз: ***“За две недели с 1 июля я свой план на месяц перевыполнил в 2 раза. Если темпы продаж не уменьшатся, то, к примеру, “Martini” до нового года не хватит”.***

Формальная причина закрытия точек Duty free – вступление в силу нового Таможенного кодекса, согласно которому режим работы таких магазинов устанавливается специальным распоряжением президента. Раз такового распоряжения нет – то и беспошлинной торговли нет. Однако тот же Таможенный кодекс предусматривает, что уже выданные лицензии на торговлю Duty free будут действовать до даты их окончания. Тем не менее, с нуля часов 1 июля по письму председателя Гостаможкомитета (ГТК) Александра Шпилевского магазинам Duty free запрещена реализация товаров.

По неофициальной информации, фирмам предложено отдать УДП 51% своего бизнеса, только в таком случае ГТК позволит им возобновить работу. Эта информация подтверждается официальными сообщениями о том, что подготовлен проект Указа президента, согласно которому лицензии на осуществление беспошлинной торговли получат предприятия с государственной долей в собственности - более 50%.

**Андрей Калиневич**



Фота: «Ведамасці»

**Крамы будуць зачыненыя,пакуль іх гаспадары не падзеляцца з дзяржавай**

**Справка**

В 2006 году 75% всего белорусского импорта дорогого алкоголя, на общую сумму более 24 млн долларов, пришлось именно на магазины Duty free.

# “Беллакт” аддалі

**Акцыянеры Ваўкавыскага прадпрыемства “Беллакт” вымушаныя аддаць дзяржаве 51% сваіх акцый. Такі «фінансавы энтузіязм» не быў добраахвотным.**

Да апошняга сходу акцыянераў “Беллакта” уладальнікамі акцый прадпрыемства былі выключна фізічныя асобы.

У канцы студзеня сходам акцыянераў на пасаду генеральнага дырэктара быў пераабраны Юры Фралоў. 84,5% уладальнікаў акцый “Беллакта” аддалі перавагу менавіта яму.

Але адразу пасля сходу на прадпрыемства завіталі прадстаўнікі Камітэта дзяржкантролю, якія прызналі вынікі галасавання несапраўднымі, і прапанавалі выпуск дадатковых акцый, большая палова якіх будзе знаходзіцца пад кантролем дзяржавы. Прадстаўнікі кантрольных службаў папярэдзілі кіраўніцтва прадпрыемства аб тым, што калі дзяржава не стане галоўным акцыянерам “Беллакта” у іх узнікнуць вялікія праблемы.

87 % акцыянераў былі вымушаныя прагаласаваць за выпуск дадатковых акцый з мэтай стварэння дзяржаўнай долі не меней за 51%.

**Радыё Рацыя**

# Как крали сахар

**Три уголовных дела возбуждены по фактам крупных хищений на Скидельском сахарном комбинате. Главному подозреваемому правоохранительные органы дали сбежать.**

На протяжении нескольких лет Скидельский сахарный комбинат торговал с российскими фирмами, которые никогда не существовали или были ликвидированы в 2000 году. Отгрузка сахара осуществлялась не по предоплате, а по фиктивным договорам, в результате чего никто с сахарным комбинатом до сегодняшнего дня не рассчитался. Это выяснили инспектора Госконтроля во время проверки предприятия. Внимание контролеров поначалу привлек факт снижения прибыли за экспорт сахара в Россию в размере 20 миллионов долларов в сравнении с 2005 годам.

Из трех уголовных дел одно, возбужденное КГБ, касается бывшего генерального директора Скидельского сахарного комбината Геннадия Карамушки – по фактам “злоупотребления служебными полномочиями и попытками кражи в особо крупном размере”. Однако, как выяснилось, теперь Геннадий Карамушка находится вне границ Беларуси. Имена еще двух человек, в отношении которых также возбуждено уголовное дело, пока держатся в тайне. По третьему уголовному делу следствие ищет “неустановленных личностей”, которые, используя реквизиты и печать ООО “Системпрофи”, занимались незаконной торговлей сахаром и успели получить прибыль в размере 5,5 тысяч долларов.

Интересно, что о чудесном исчезновении еще в мае 2006 года 32-х вагонов скидельского сахара, который был отправлен в Россию, в Скиделе было известно практически каждому жителю. В городе открыто говорили, что в воровстве принимает участие высшее руководство области, а у директора Карамушки будто бы есть завод в России, куда и вывозят скидельский сахар. Сотрудники комбината показывали «фазенды» - трехэтажные дома, где проживает директорат. Рядом с предприятием был открыт ресторан «Цукравар», куда приезжали отдохнуть гродненские чиновники.

Однако уголовные дела были заведены только после того, как в конце прошлого года директор Геннадий Карамушка был уволен с работы лично председателем Гродненского облисполкома Савченко. А уже после того, как Карамушка исчез в неизвестном направлении, «проснулись» Госконтроль и КГБ и начали шевелить те дела, за которые теперь некому отвечать.

Контрольный пакет акций ОАО «Скидельский сахарный комбинат» принадлежит государству – 99,7%. На предприятии работают более тысячи человек. Заработная плата рабочих не менялась 5 лет – как была так и остается около 200 долларов. А теперь большинство из них отправлены в отпуска за свой счет – «из-за тяжелого финансового положения». Руководство комбината во главе с новым директором продолжают работать и получать зарплату.

**Светлана Кравцова**

# Беларусы без дзяцей

**Шмат хто з нас лічыць тыповай сям'ю з чатырох чалавек. На самой справе, такіх сем'яў у Беларусі цяпер толькі 18,4 %, а сем'яў з пяць чалавек і болей – толькі 6,4%. Для цяперашніх беларусаў дзеці – фактар рэзкага зніжэння ўзроўню жыцця, таму ў беларускіх сем'ях нараджаецца ўсё менш дзяцей.**

Сацыяльна – эканамічны партрэт сярэдняй беларускай сям'і можна скласці па публікацыі Мінстата “Асноўныя паказчыкі матэрыяльнай забяспечанасці хатніх гаспадарак Рэспублікі Беларусь” за 2006 год.

У Беларусі пражывае 3714,3 тыс. сем'яў. 24,8% з іх – складаюцца з аднаго чалавека, 27,1% - з двух. Для параўнання: у 1995 г. доля сем'яў з адным чалавекам была 18,6%, з двума – 24,7%, з 5 і болей – 10,6%.

Дзяцей маюць толькі 38,1% сем'яў, трохі болей за 1,4 мільёны чалавек. З іх у 904,2 тыс. хатніх гаспадарак ёсць толькі адно дзіця. Па тры дзіцёнкі маюць толькі 61,7 тыс сем'яў (1,7%).

У 27,8% беларускіх сем'яў увогуле няма працуючых. Зыходзячы з таго, што сярэдняя беларуская сям'я складаецца з 2,6 чалавек (у 1995 годзе было 2,9 чалавек), то добрабыт больш за 1 мільён чалавек залежыць ад выплаты пенсій, дапамогаў, а таксама ад штодрасці сваякоў ды вынікаў дачнай працы. Яшчэ у 26,7% сем'яў – толькі адзін працуючы.

Самая вялікая група хатніх гаспадарак (23,9% сем'яў з дзецьмі і 26,9% - без дзяцей) – у сярэднім на чалавека мае даход 300,1 – 400 тысячаў рублёў (140-186 даляраў). Сем'яў з штомесячны даходам на чалавека больш за 700,1 тысячаў рублёў (326 даляраў) у краіне толькі 1,8%. Гэта – эканамічная эліта краіны. Гэтая эліта амаль цалкам супадае з наменклатурнай групай, у ты ліку ў сілавых структурах.

Бедных у Беларусі (са штомесячным даходам на чалавека менш 200 тысяч рублёў, ці 93 даляраў) - 22,6% у сем'ях з дзецьмі і 11,5% у сем'ях без дзяцей.

Такім чынам, пры старэнні насельніцтва і складанай дэмаграфічнай сітуацыі ў доўгатэрміновай перспектыве ўнутраны попыт Беларусі будзе нязменна скарачацца, таксама, як і прывабнасць нашага рынка для інвестараў.

**Паводле Навукова-даследчага цэнтра Мізеса**

Ёсць справа

*Чыноўнікі ад адукацыі не збіраюцца ствараць у Гродне беларускія класы.*

# Адзін беларус

**Толькі адну заяву, у школе № 32, бацькі падалі на навучанне дзіцяці ў першам беларускамоўным класе. Але клас не будзе зфармаваны, пакуль такія ж заявы не напішуць бацькі яшчэ 9 будучых першакласнікаў школы.**

Як паведамлялі "Ведамасці" (№1), беларускамоўныя першыя класы могуць быць сфармаваныя ў гімназіях №№ 4, 6, 7 і школах №№ 10, 26, 32. Пра гэта дамовіліся Гродзенская гарадская Рада Таварыства Беларускай Мовы (ТБМ) з гарадскім упраўленнем адукацыі.

"Ведамасці" высветлілі, што гарадскія ўлады і адміністрацыя школ не паведамляюць бацькам пра магчымасць навучаць дзяцей па-беларуску. Толькі школа № 32 правяла нейкую інфармацыйную кампанію сярод бацькоў: на дошцы інфармацыі размясцілі адмысловую аб'яву, намеснік дырэктара па пачатковых класах сустрэлася з бацькамі ў дзіцячых садках, дала абвестку ў газету. У СШ № 10 абмежаваліся толькі аб'явай на дошцы інфармацыі. А ў астатніх гімназіях ды школе пра магчымасць запісаць дзіця ў беларускі клас бацькам ніхто не паведамляе.

Больш таго, нам. дырэктара пачатковых класаў гімназіі №6 Елена Маянская заявіла: ***"Я наогул ня ведаю хто вам даваў такую інфармацыю, мы не збіраліся набіраць беларускамоўныя першыя класы. Гэта некалі даўно такое было".***

У СШ № 26, якая доўгі час заставалася адзінай беларускамоўнай, па словах нам. дырэктара Ганны Каяла, таксама фармаваць у гэтым годзе беларускамоўныя класы не збіраюцца.

У гімназіі №7 нам. дырэктара пачатковых класаў Ларыса Каржова заявіла, што навучэнцам гімназіі цяжка вучыць беларускую мову, таму што ***"атрымліваецца, у нашых дзяцей гэта– як бы другая замежная мова".***

Гродзенскі Рух "За Свабоду" папярэджваў пра тое, што гарадскія ўлады і адміністрацыя школ у большасці не зацікаўленая заахвочваць бацькоў да беларускамоўных класаў.

"Ведамасці" заклікаюць усіх чытачоў далучыцца да гэтай справы. Вы можаце выразаць улётку, якую мы друкуем ніжэй і перадаць вашым суседзям, знаёмым, бацькам будучых першакласнікаў.

Улады спасылаюцца на тое, што бацькі не хочуць аддаваць дзяцей у беларускія класы, сёння відавочна, што беларускія класы ўладзе невыгадныя. Толькі грамадзянская актыўнасць можа вярнуць у гродзенскія школы беларускую мову.

*Выражы ды перадай суседу*

## ЗАПІШЫ ДЗІЦЯ Ў БЕЛАРУСКІ КЛАС!

БЕЛАРУСКАЯ МОВА - ГЭТА МОВА ЭЛІТЫ І БАГАТЫХ ЛЮДЗЕЙ!

- Самая дарагая рэклама на беларускім рынку робіцца па-беларуску. Па-беларуску да нас звяртаюцца Samsung, Panasonic, Bosch, Renault, Adidas, Pepsi, Indesit, Nescafe, Gallina Blanca, Hugo Boss.
- Сапраўдны рок у Беларусі - беларускамоўны. NRM, Крама, Нейра Дзюбель спяваюць па-беларуску.
- Беларуская мова прызнана ў Еўропе другой пасля італьянскай па мілагучнасці і спеўнасці.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА - ГЭТА МОВА БУДУЧЫНІ!

- З новага навучальнага году ў беларускіх універсітэтах беларуская прафесійная мова становіцца абавязковай дысцыплінай, таксама будуць уведзеныя беларускамоўныя плыні і групы.
- У гэтым годзе на 12 тысяч павялічылася колькасць выпускнікоў, якія здавалі цэнтралізаванае тэставанне па беларускай мове.
- У замежных ВНУ кожны год павялічваецца набор студэнтаў на вывучэнне беларускай мовы.
- Кампанія Microsoft абяцала, што створыць беларускамоўны інтэрфейс сваіх праграм.

ДАЛУЧАЙСЯ!

Беларускамоўныя класы адкрываюцца ў гімназіях №№ 4, 6, 7, а таксама сярэдніх школах №№ 10, 26, 32.
Як запісацца - пракансультуюць у Гродзенскай гарадской Радзе Таварыства Беларускай Мовы імя Ф. Скарыны па тэлефонах: (0152) 43-07-58, (029) 913-18-31.

РУХай з намі

# Памідораў: "Гісторыю Гродна трэба адстаяць"

**Вядомыя беларускія музыкі працягваюць выступаць у абарону гістарычнай часткі Гродна. 17 ліпеня ў нашым горадзе ў межах кампаніі "Музыкі супраць разбурэння Гародні" адбыўся канцэрт вядомага шоумэна і музыкі Аляксандра Памідорава.**




Фота: «Ведамасці»

На канцэрт Памідорава сабралося каля 170 гродзенцаў

На зладжаны гродзенскім Рухам "За Свабоду" і гродзенскай арганізацыяй Партыі БНФ канцэрт Аляксандр Памідораў прыехаў па дарозе на Басовішча-2007, фестываль музыкі маладой Беларусі, які штогод адбываецца ў Польшчы.

Выступаючы перад гродзенцамі, Аляксандр Памідораў падкрэсліў, што канцэрт - гэта яго асабісты ўнёсак у захаванне гістарычнай спадчыны Гродна - аднаго з найпрыгажэйшых гарадоў Беларусі:

***"Гэта ўсё робіцца, каб абараніць старыя камяніцы, стары горад. Мне ўсё гэта блізка, бо ў Мінску, адкуль я родам, адбываецца тое самае. Паралельна ў двух буйных культурніцкіх цэнтрах Беларусі дзеля будаўніцтва нейкіх гатэляў мы пазбаўляемся нашай спадчыны. Так не можа быць!. У мяне гэта ў галаве не ўкладваецца. Мой канцэрт - гэта не толькі "мастацкі ўнёсак" у абарону Гродна. Гэта і асабісты жэст. Я шаную гісторыю і цікаўлюся ёю. І я вельмі люблю Гродна. Я не магу стаяць у баку, калі ўлады руйнуюць гісторыю",*** - сказаў Аляксандр Памідораў.

У Гродна, у межах кампаніі "Музыкі супраць разбурэння Гародні" ўжо адбыліся канцэрты Віктара Шалкевіча, Касі Камоцкай, Лявона Вольскага. Гродзенскі Рух "За Свабоду" мае намер надалей працягваць у абарону Гродна ад разбурэння культурніцкія ды інфармацыйныя акцыі

# Гродзенскі Грунвальд

**У Гродна адзначылі 597-ыя ўгодкі Грунвальдскай бітвы. 13-15 ліпеня гарадзенскі Рух "За Свабоду" супольна з гарадской арганізацыяй Партыі БНФ правёў шэраг мерапрыемстваў.**

**13 ліпеня** ў памяшканні гродзенскага філіялу Таварыства беларускай школы адбылася дыскусійная вечарына "Месца Грунвальда ў вызначэнні гістарычных лёсаў народаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы: міфы і рэальнасць". У дыскусіі ўзялі ўдзел доктар гістарычных навук Алесь Краўцэвіч, даследчык Грунвальду Руслан Гагуа, свае тэзісы даслаў гісторык Генадзь Сагановіч.

Алесь Краўцэвіч адзначыў, што перамога беларусаў пад Грунвальдам мела агромнае значэнне: «***Грунвальдская бітва практычна прыпыніла нямецкую каланізацыю. Таму што якраз пачатак XV стагодзздзя – гэта пачатак эканамічнага і дэмаграфічнага ўздыму Заходняй Еўропы і новы ўздым каланізацыі».*** Планы немцаў былі скіраваныя на рэдка заселеныя тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Грунвальд для Гродна - гэта асаблівая падзея. Нягледзячы на ўсе спрэчкі гісторыкаў, пасля Грунвальдскай перамогі спыніліся крыжацкія напады на Гродна, які стаў пераўтварацца ў сапраўдны горад, а не ў абарончы замак.

**14 ліпеня** ініцыятары Грунвальдскіх угодкаў зладзілі прыборку ля Каложскай царквы - якраз на тым месцы, дзе ўсталяваны памятны знак Грунвальдскіх падзеяў "Пагоня на Грунвальд".



Фота: pahonia.promedia.by

**Уборка каля знака «Пагоня на Грунвальд»**

Існуе легенда, што частка войскаў ВКЛ вырушыла на Грунвальд менавіта з гэтага месца.

У нядзелю **15 ліпеня** ля памятнага знаку "Пагоня на Грунвальд" маладыя актывісты дэмакратычнага руху ўсклалі кветкі ў гонар вяяроў.

За маладзёнамі назірала міліцыя і АМАП на дзьвюх машынах. Калі актывісты пад бел-чырвона-белым сцягам гаварылі прамовы ў гонар герояў Грунвальда, да маладзёнаў падыйшоў супрацоўнік Ленінскага РАУС Пётр Ленец і заявіў, што гэта «несанкцыянаваная акцыя» . Міліцыянт прыгразіў затрыманнем.

Актывісты сабраліся каля знака «Пагоня на Грунвальд» і ўвечары. Быў запалены вялізны крыж памяці з сотні знічак. Так моладзь Гродна адзначыла чарговыя ўгодкі Грунвальдскай бітвы.

**Даведка**

15 ліпеня 1410 году на Грунвальдскім полі абылася вялікая бітва паміж крыжакамі пад камандваннем вялікага настаўніка Крыжацкага ордэну Ульрыха фон Юнгінгэна і спалучанымі сіламі пераважна беларускіх і польскіх войскаў пад камандваннем караля Польшчы Уладзіслава Ягайлы і князя Вялікага Княства Літоўскага Вітаўта. Падчас гэтае бітвы быў забіты вялікі настаўнік Крыжацкага ордэну і гэтым самым пачаўся канец магутнасці крыжакоў.

Выдаецца па ініцыятыве Гарадзенскага Руху «За Свабоду» Адрас рэдакцыі: г. Гродна, пл Тызенгаўза,1. Галоўны рэдактар Антоні Тызенгаўз Падпісана ў друк 22.07.2007.
Наклад адпаведна заканадаўству. Надрукавана на ўласным абсталяванні рэдактара. Замовіць падпіску на электронную ці папяровую версію газеты «Ведамасці» можна па адрасе: zasvabodu.hrodna@gmail.com